*Літаратура ў кантэксце жыцця*

Любоў БАРАНОЎСКАЯ

# З ЛЮБОЎЮ І СПАГАДАЙ!

## ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЯ ТРАКТОЎКА ВОБРАЗАЎ ФАЎНЫ Ў ПАЭЗІІ ЯНКІ СІПАКОВА

Яшчэ са старажытных часоў жыццё чалавека праходзіла ў цесная узаемасувязі з прыродай, таму жывёлы займаюць значнае месца ў практычнай дзейнасці людзей, у іх вераваннях і ў творах вуснага народнага мастацтва. Невыпадкова гісторыя развіцця культуры пачалася з розных формаў зоацэнтрызму – абагаўлення і шанавання жывёлаў (татэмізм, фетышызм). Антрапацэнтрызм, які прыйшоў яму на змену, вылучыў чалавека са свету прыроды.

У казачным эпасе склалася асноўная тыпалогія анімалістычных вобразаў, якая атрымала далейшае развіццё ў мастацкай літаратуры: воўк – дурны, злосны (у народных казках “Сьвяты воўк”, “П’яны воўк”); ліса – хітрая (казка “Ліса-каталічка”) і г. д. На працягу значнага часу, як бы ні зніжалася роля жывёлаў у духоўнай культуры, анімалізм застаецца сэнсаўтваральным фонам, на якім фармуюцца моўныя і культурныя стэрэатыпы, паэтычныя вобразы. «Калі зоацэнтрызм ёсць стадыя, што гістарычна перажыла сябе, прайшла стадыю культураўтварэння, то анімалізму належыць нарастальная роля ў складанні ўмоў да будучай, экалагічна збалансаванай культуры, якая пераадолела б “згубную” аднабаковасць антрапацэнтрызму»[1], – адзначыў даследчык М. Эпштэйн.

Шэраг вершаваных твораў беларускіх класікаў ілюструе шматаблічны свет фаўны (“Страцім-лебедзь” М. Багдановіча, “У заапарку” М. Танка, “Белавежскі алень” У. Караткевіча, “Птах” А. Разанава і інш.). У беларускай літаратуры другой паловы ХХ ст. назіраецца тэндэнцыя шырокага выкарыстання анімалістычных вобразаў. Найбольш часта яны сустракаюцца ў творах на экалагічную тэму, якая цяпер займае месца побач з чарнобыльскай. Прыкладам таму служыць творчасць Янкі Сіпакова.

У вершаваных творах паэта шырокім спектрам вобразаў, матываў, мастацкіх параўнанняў, метафар пададзена мастацкая анімалістыка. Фаўна ў яго лірыцы – гэта ваўкі і мядзведзі, зубры і коні, шматлікае птаства. Дарэчы, птушкі асабліва прыкметныя ў сіпакоўскай паэзіі. Іх вобразы даволі разнастайныя. Ёсць тут і жаваранкі, і салаўі, і лебедзі, і вароны, і свойскія гусі і г. д. Кожны з іх у сваю чаргу змяшчае пэўную сімволіку. Шматвяковыя традыцыі спецыфічнага ўспрымання птушак адбіліся ў вершаваных радках Я. Сіпакова. “Салаўіная бяссонніца”, “лебядзіная вернасць”, “белыя вароны” – гэтыя словазлучэнні маюць сваю семантычную нагрузку, якая дапамагае тлумачыць побыт, звычаі чалавека.

Вобразы птушак часта ўваходзяць у склад параўнанняў:

*Званок... Як спеў... Так звоніш ты адна...*  
*Здалося, жаўранак з-пад купіны ўсхапіўся.*  
*Павіс у небе... Ты – нібы вясна,*  
*Мая каханая!*[2]

Чаканне цябе.

Або:

*Твае рукі, твае рукі нада мною, –*  
*Нібы лебедзі над белаю зімою* (1, 153).

Твае рукі.

Здаецца, невыпадкова існуе ў сіпакоўскай лірыцы парадыгма душа чалавека – птушка. Карані яе ідуць яшчэ з дабіблійных часоў, калі ў міфалогіях Егіпта, Вавілона, Грэцыі быў пашыраны вобраз душы-птушкі, які прасачыўся праз стагоддзі і ўвайшоў у шматлікія творы сусветнай літаратуры. Гэты вобраз сустракаецца і ў творчасці беларускіх паэтаў (вершы “Вясёлаю маланкаю” П. Панчанкі, “Жаўранак – звонкая ніць” У. Караткевіча, “Буслы” Л. Геніюш і інш.).

Неаднойчы асэнсоўвае паэтычны вобраз **душы-птушкі** Я. Сіпакоў як у вершах, так і ў празаічных мініяцюрах: *“У аднаго філосафа ёсць дужа цікавая думка: чым вышэй у неба ўздымаецца птушка, тым меншай яна здаецца тым, хто застаўся на зямлі.*

*Тым большымі, дададзім мы ад сябе, здаюцца самі сабе тыя, хто ніколі не ўзлятаў у неба”* (2, 358).

Зямныя будні звужаюць кругагляд, наадварот, далягляд шырыцца з вышыні птушынага палёту. Таму душа чалавека павінна абавязкова быць крылатай, і менавіта такая душа ў самога лірыка. Даследчыца літаратуры Л. Ламека зазначыла пра творчую асобу паэта: “У кожнай думкі Я. Сіпакова – сваё адметнае жыццё, знешняя абалонка, пластыка, сваё дыханне і **ўзмах крыла** (вылучана намі. – **Л. Б.**)”[3]. Вера ў свае крылы – зарука паспяховага палёту сярод штодзённых клопатаў:

*Крылы нашы – для радасці, мар,*  
*Крылы нашы – для працы і свята.*  
*Крылы – лішнія, крылы – цяжар,*  
*Калі ў іх не верыш зацята* (1, 190 – 191).

Варта ў крылы паверыць свае.

“Крылатай душы” чалавека, душы-птушцы супрацьпастаўлены ў сіпакоўскай паэзіі “бяскрылыя гусі”. Гэта алегарычны вобраз таго, хто “патануў у быце”, не хоча рухацца наперад, каго задавальняе сытае прыземленае жыццё сучасных мяшчан:

*Цяпер жа яны пасыцелі*  
*І ветразі – белыя крылы –*  
*Што небам, палётамі трызняць,*  
*Да звыклай зямлі апусцілі* (1, 114).

Бяскрылыя гусі.

*Любоў Георгіеўна Бараноўская — аспірантка кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова. Закончыла філалагічны факультэт гэтай навучальнай установы (1998). Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў школах г. Магілёва.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паэт пры дапамозе эпітэтаў супрацьпастаўляе два вобразы птушкі: "бяскрылай" і "раскальцаванай".

Раскальцаваная птушка – а гэты лейтматыў праходзіць праз усю лірыку Я. Сіпакова – з'яўляецца сімвалам яго паэзіі, сімвалам волі, прагі да творчасці:

*Верш!*
*Ляці*
*раскальцаванай птушкаю:*
*У цябе –*
*ўвесь сусвет пад крыллямі* (1, 40).
Каб неба цябе не загушкала...

Уражання свабоды, палёту аўтар дасягае не толькі пры дапамозе метафар, эпітэтаў, ён робіць гэта графічна, праз малюнак верша. Такая форма верша, па словах даследчыка З. Санюка, нагадвае палёт самой птушкі[4]. Вершы Я. Сіпакова – сапраўдныя гравюры, дзе пры дапамозе рыс-радкоў перададзены драматызм пачуцця, кульмінацыйныя моманты, унутраны спакой-раўнавага. Радкі нібы з'язджаюць уніз, калі паэт апавядае пра тое, як сяброўка лебедзя, быццам камень, імкліва кінулася ўніз. Аўтар, нібы мастак, хуткімі штрыхамі, намаляваў гэтае падзенне ў прорву:

*І горкі сум па сябруку сваім*
*Яна ў апошнім выдыхнула стогне,*
*А потым склала крылы –*
*і за ім,*
*Як камень,*
*паляцела*
*у прадонне* (1, 17).

Верш "Ты кінуў слова ў мяне..." нагадвае кардыяграму, графік, дзе самыя гучныя радкі, на якія прыпадае значная сэнсавая нагрузка, быццам зашкальваюць па сваёй даўжыні ў суадноснасці з іншымі радкамі:

*Відаць, так*
*Імкліва набліжаецца і вырастае Зямля*
*Для птушкі,*
*Якая праз секунду разаб'ецца аб засохлую дарогу.*
*Можа, адхінуцца?*
*Навошта!* (1, 172).

Мастак адступае ад канонаў класічнага вершаскладання. З. Санюк слушна сказаў пра гэты сіпакоўскі верш: «Усеахопны імпэт рассоўвае "матэрыю" самой паэзіі, вызваляе яе ад праграмна-класічнай сістэмы вершаскладання, калі знікаюць усялякія межы і каноны жанраў, стыляў і накірункаў, бо паэзія сапраўды можа ўвабраць у сябе ўсё».

У лірыцы Я. Сіпакова адзін з самых пашыраных анімалістычных вобразаў – вобраз **каня**. Спакон веку конь быў незаменным памочнікам у жыцці беларуса-земляроба. Дарэчы, і самому паэту добра вядомая вясковая праца, ён сам "ад зямлі".

Амаль увесь свой працоўны дзень чалавек адчувае сябе запрэжаным у адзін хамут з канём:

*Мой бацька быў як зросшыся з канём*
*І, хоць ішоў па баразне за плугам,*
*Сам плуг цягнуў. Таксама і калёсы*
*Усцягваў на пагорак – стомлены, змакрэлы,*
*Ён напінаўся болей за каня,*
*Шукаў нагой зручнейшае апоры,*
*І дыхаў цяжка, і спяшаўся так,*
*Нібы ягонай пугай іх абодвух*
*Хтосьці невідомы падганяў.*
*З канём, здаецца, ён не разлучаўся...* (1, 192).
Элегія.

Конь – спадарожнік чалавека. Вобраз працаўніка з канём паўстае ў памяці паэта, яго нагадваў сваім выглядам сівы конь:

*Мы дзялілі з табой*
*Наша поле і луг,*
*Дапаўнялі сабой*
*І калёсы, і плуг* (1, 197).
Конь, сівы ад гадоў...

У наш час каня на пашы замянілі трактары: *"Кажу сягоння я такое, / Бо ты – нібы ўжо госць у нас: / Перад табою, за табою / Барозніць трактар твой папас"* ("Ах, мілы конь, ах, мілы косю..."; 1, 134). У горадзе коні заменены машынамі. Цяпер коні, якія ідуць па праспекце, успрымаюцца як дзіва: *"Дзівіліся – ведама, коні! – на тратуары тлумныя"* ("Коні на праспекце"; 1, 41). Даследчык А. Бельскі называе каня "сіпакоўскім татэмам". У частотна-тэматычным паказальніку[5], складзеным даследчыкам, налічваецца звыш сямідзесяці твораў пра каня ў беларускай паэзіі, найбольшая колькасць якіх належыць Я. Сіпакову. "У паэзіі Я. Сіпакова вобраз гэтай жывёлы займае ключавое месца", – зазначае навукоўца.

Немалаважную ролю ў лірыцы паэта адыгрывае вобраз **мядзведзя**, які найчасцей сустракаецца ў прыродаапісальных вершах. Але тут трэба зазначыць, што творца часта малюе вонкавую і ўнутраную карціны жыцця прыроды. Так, у вершы "Маналог мядзведзя, які пасля першай спячкі выйшаў з бярлогі" сама назва скіроўвае на адлюстраванне ўнутранага свету звера, яго дзеянняў. У творы няма апісання паводзінаў жывёлы, яе аблічча. Рэцыпіент падсвядома ўспрымае дзеянні звера: вось ён выйшаў з бярлогі, прыслухаўся, насцярожыўся, пачуў гукі, прынюхаўся, прагнаў смагу. Гэтыя дзеянні ілюстраваны думкамі мядзведзя. У сінтаксічным плане перадаць такія думкі дапамагае прыём пастаноўкі пытанняў і адказаў (што характэрна больш для дыялогу, чым для маналогу). Яскравай перадачы думак жывёлы спрыяюць асаблівасці вершаскладання Я. Сіпакова. Разарваныя радкі – увасабленне прыёму "пытанне – адказ", што стварае ўражанне "ўнутранага маналогу":

*Ціха!*
*Нейкія дзіўныя гукі?..*
*Уцякаць?*
*Але ж не! Здаецца,*
*Небяспекай наўколле не пахне.*
*Дык хто ж тады там балбоча?*
*Зірну!..*
*То вада размаўляе!* (1, 34).

Пра тое, што аўтар спрабуе дакладна выявіць думкі мядзведзя, сведчаць мастацкія параўнанні, звязаныя з побытам мядзведзя. Так, ноч *"доўгая, быццам пушча"*, *"цёмная, нібы бярлога"*. Мядзведзь любіць мёд, ён здольны яго есці аж да гаркаты ў роце. Гэтую слабасць звера аўтар паказаў і ў вершы "Трава – мядзведзь мядзведзем...". У вершы з добрым гумарам абмаляваная сітуацыя, калі пчолы збіраюць нектар з духмяных кветак. Трава нагадвае касматага мядзведзя, якога быццам абляпілі насякомыя, бо ён спакусіўся на іх мёд:

*Трава – мядзведзь мядзведзем.*
*У яе,*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Як у мядзведжую поўсць калючыя дзяды,*
*Паўпіваліся пчолы...* (1, 59).

Вобразу мядзведзя са зборніка Янкі Сіпакова **“Дзень”** (1968) супрацьстаіць вобраз гэтага звера з апавядання Івана Пташнікава “Арчыбал”* (1988). Калі Я. Сіпакоў апісвае мядзведзя ў так званым прыродным асяроддзі (яго герой жыве ў лесе, ён вольны), то лёс Арчыбала вырашае чалавек. У апавяданні адлюстраваная бездапаможнасць, нават адчай звера, які жыве ў няволі. Няволя жывёлы таксама цікавіла і Я. Сіпакова. З вобразам Арчыбала перагукаецца вобраз ваўчыцы з верша “В а ў ч ы ц а ў з в я р ы н ц ы”. Страта сям'і (дзеці ваўчыцы засталіся адны ў бярлозе; мядзведзіха і дачушка Арчыбала загінулі), немагчымасць самастойна вырашаць свой лёс – такое становішча, куды жывёлы трапілі праз людзей. Гэтыя істоты ператвараюцца ў лялек, на якіх можна паглядзець, якіх можна пагладзіць і нават дзеля забавы зрабіць мішэнню.

Здаўна **воўк** лічыўся страшным зверам, які стагоддзямі наводзіў жах на людзей. З ім звязаны самыя розныя нядобрыя прыкметы, павер'і: усе чулі пра ваўчыныя вяселлі ў піліпаўку; паводле рэлігійных крыніц – святы Юр'я сцярог жывёлу ад ваўкоў; у паданнях апісаны загадкавыя ваўкалакі. У старадаўнасці воўк з'яўляўся татэмам многіх плямёнаў. Разам з тым лічылася, што правадыры гэтых плямёнаў маглі ператварацца ў яго. Паводле легендарных звестак, славуты князь Усяслаў Чарадзей мог абарочвацца ў ваўкалака.

Традыцыйная трактоўка вобраза ваўка як драпежніка, аднаго з самых лютых прадстаўнікоў беларускай фаўны, існуе ў творчасці Якуба Коласа, Янкі Купалы і іншых беларускіх пісьменнікаў.

У другой палове мінулага стагоддзя, калі ў літаратуры ўсё больш актыўна стала асэнсоўвацца экалагічная праблема, вобраз ваўка набыў новую ідэйна-мастацкую трактоўку. Цяпер воўк пераўвасобіўся ў аднаго з самых бездапаможных звяроў. Гэта адлюстроўвае верш “Ваўчыца ў звярынцы” Янкі Сіпакова: *“Кранаў за сэрца голас яе слабы, / Хоць ён і з пашчы воўчае выходзіў”* (1, 112). І Арчыбал, і ваўчыца цягнуцца да волі. Тут створаны яскравы псіхалагічны малюнак:

*Нялёгка з пушчай вольнай разлучыцца*
*І апынуцца ў цеснай клетцы...*
*Кідаецца ва ўсе бакі ваўчыца*
*І на свабоду вырвацца імкнецца.*

Іван Пташнікаў таксама вельмі праніклiва выявіў унутраны свет жывой істоты: “І ён, прыпаднеяўшыся на заднія лапы, застыў у сваёй жалезнай клетцы, якую падкідвала на выбоінах разам з машынай, выцягнуў толькі з адтуліны морду ў наморднiку і, хліпаючы ноздрамі, лавіў густы салодкі пах жыта – глядзеў і глядзеў у праём пад брызент на блізкую волю, аж мітусілася ў падслепаватых хворых вачах”[6].

У сіпакоўскім вершы ўражвае такая мастацкая дэталь, як высунутыя праз краты лапы. *“Хай хоць яны пабудуць на свабодзе”*, – ва унісон жаданню ваўчыцы заўважае са шкадаваннем аўтар. Вобраз гэтых лапаў перагукаецца з вобразам крыві, што палілася праз краты з рота Арчыбала: “З рота ў Арчыбала пайшла гарачая, як вар, кроў – пырснула за металічную рашотку на волю, – ён убачыў ля сябе толькі чорна-чырвоны краёк шырокай белай лясной паляны”[7]. Кроў тут сімвалізуе вольную душу мядзведзя. У лірыцы Я. Сіпакова ваўчыца ў клетцы – сімвал прагі да волі, сімвал зняволенага жывёльнага свету, лёс і жыццёвыя ўмовы якога амаль цалкам залежаць ад чалавека, і нават сімвал самога зняволенага грамадства.

Закрануўшы тэму прыручэння дзікіх жывёлаў у першым сваім зборніку **“Сонечны дождж”** (1960), Я. Сіпакоў звяртаўся да яе яшчэ не раз. Вобраз ваўка, які апынуўся за кратамі, зноў намаляваны ў вершы “С к а р г а п р ы р у ч а н а г а в а ў к а”. Толькі на гэты раз паэт не проста паказвае паводзіны звера, а імкнецца адлюстраваць яго ўнутраны свет, перадае, якое прыніжэнне зведвае драпежнік, апынуўшыся ў клетцы, дзе насупраць скачуць “асмялеўшыя дужа зайцы”. Тут выкарыстаны такі мастацкі прыём, як анімалістычны псіхалагізм. Аўтар спрабуе выявіць думкі прыручанага ваўка, пасаджанага за краты. Нявольнік звяртаецца да дырэктара звярынца, каб ён адпусціў яго на волю: *“Адпусці... / Не чакай маёй згубы; / Разарвецца ад крыўды сэрца; / Бо калі нават шчэру я зубы – / Вам здаецца, / Што воўк смяецца”* (1, 109). Дзякуючы гэтаму прыёму чытач можа ўбачыць свет вачыма зняволенай жывёлы. Паэт падкрэслівае трагічнасць сітуацыі, у якой апынуўся прадстаўнік так званай дзікай фауны. Вобраз ваўка тут выступае як сімвал хцівасці і драпежнасці грамадства, якое паставіла перад сабой на калені не толькі жывёлу, але і самога чалавека. Звярыныя драпежніцкія інстынкты часам бяруць верх над людскім розумам, падмяняюць спагаду, добразычлівасць, беражлівае стаўленне да навакольнага свету.

Такім чынам, калі традыцыйна вобраз ваўка быў сімвалам свабоды, моцы, адзінства ваеннай дружыны, роду, нейкай жорсткасці, то ў сіпакоўскай лірыцы воўк – слабы і бездапаможны – з'яўляецца сведчаннем хцівасці сучаснага грамадства.

Анімалістычныя вобразы маюць выключную значнасць у мастацка-вобразнай сістэме твораў Янкі Сіпакова, яго канцэпцыі і філасофскім асэнсаванні жыцця і чалавечага лёсу. У творах на экалагічную тэму яны з'яўляюцца не толькі фонам падзей і характараў, але і паўнавартаснымі дзейнымі асобамі. Анімалістычныя вобразы дапамагаюць паэту тлумачыць розныя з'явы прыроды і, нарэшце, асэнсаваць сябе, уласныя маральныя прынцыпы, сацыяльныя прыярытэты грамадства.

---

* Пра гэты твор Івана Пташнікава распавядалася у артыкуле **Таісы Грамадчанкі** “З любові выспеленае слова: Штрыхі да партрэта Івана Пташнікава”, змешчаным у верасньскім нумары нашага часопіса за 2000 г. – *Заўвага рэд.*

---

[1] **Эпштейн М.** “Природа, мир, тайник вселенной”: Система пейзажных образов в русской поэзии. – Москва, 1990. С. 89.

[2] **Сіпакоў Я.** Выбраныя творы: У 2 т. Т. 1. С. 153. – Мінск, 1995. Далей цытаты падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем тома і старонкі ў дужках.

[3] **Ламека Л.** Неспатольная прага крыла // Сіпакоў Я. Выбраныя творы: У 2 т. Т. 1. С. 7.

[4] Гл.: **Санюк З.** “З душы ўвесь чалавек сабраны...”: Літаратурны партрэт Янкі Сіпакова // Роднае слова. 1993. № 6. С. 7.

[5] Гл.: **Бельскі А.** Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння тыпалогіі) // Веснік БДУ. Серыя 4. 2000. № 2. С. 28 – 32.

[6] **Пташнікаў І.** Львы: Апавяданні. – Мінск, 1991. С. 151.

[7] **Тамсама.** С. 167.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова